Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 37 г. Гродна»

Рэспубліканскі конкурс сачыненняў «Мая Радзіма — Беларусь»

# САЧЫНЕННЕ «ДЗІЎНЫ СОН»

Аўтар: Емяльянчык Славяна Аляксандраўна, вучаніца V «А» класа
Кіраўнік: Савіч Алена Яўгеньеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры

красавік 2024

Дзіўны сон

За вокнамі аўтобуса мільгаюць краявіды Мінска: экскурсія «Шляхамі памяці», на жаль, заканчваецца... Праз некалькі гадзін будзем дома. Уражаная ўбачаным і пачутым у час экскурсіі, я гартаю кнігу «Беларусь — наша Радзіма». Некалькі гадоў назад мне, тады першакласніцы, уручылі яе ў школе як падарунак ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Для мяне гэта кніга стала своеасаблівым дакументам падарожніка. Люблю параўноўваць тое, што на малюнку, з тым, што бачу. Параўноўваць і думаць...

Якая ж ты цудоўная, Радзіма! Якая слаўная ў цябе гісторыя! Які вялікі твой народ — беларусы! Углядаюся ў мілыя краявіды роднай зямлі — і малюнкі нібы ажываюць ...

... Я крочу па мяккай мурожнай траве, залатое калоссе ласкава кранае мяне за рукі. Насустрач ідзе цудоўная жанчына ў белай ільняной сукенцы. Не ідзе — плыве! З гонарам нясе яна сваю постаць наперад! Адчуваецца нейкая незвычайная моц і сіла ў гэтай жанчыне! Я гляджу і захапляюся! Захапляюся яе хадой, веліччу, упэўненасцю. Штосьці аддалена знаёмае згадваецца мне ў яе вобразе. Хто ты, знаёмая незнаёмка? Побач з ёй — шасцёра хлопцаў-волатаў! Яны гамоняць, смяюцца і набліжаюцца да мяне.

Жанчына не вельмі маладая, але прыгажуня — вачэй не адвесці! Яна шчыра ўсміхаецца, і маршчынкі цёплымі праменьчыкамі разыходзяцца вакол яе глыбокіх, нібы азёрныя хвалі, вачэй. Залацістыя, быццам спелае жыта, валасы абрамляюць ветлівы твар яе. У руках жанчына трымае кветкі, букецік васількоў. Яны вельмі падобныя да вочак майго маленькага брацік Грышы.

Убачыўшы мяне, незнаёмцы спыняюцца.

— Хто вы? — здзіўлена пытаюся я.

— Мы родныя браты, беларускія гарады! — адказваюць хлопцы.

— Як жа вас завуць? — цікаўлюся ў іх.

— А ты здагадайся! — усміхаюцца волаты.

Адзін з іх, ганарлівы, упэўнены ў сабе хлопец, пачынае весці размову:

— Я старэйшы брат! Плошча Перамогі, Палац Рэспублікі, Нацыянальная бібліятэка, утульнае Траецкае прадмесце знаёмы кожнаму беларусу. І хто ж я?

— Мінск! Галоўны горад нашай краіны! Адзін з самых прыгожых гарадоў Еўропы! — з гонарам адказваю яму.

— А мяне пазнаеш? — пытаецца другі брат, стрыманы і сур’ёзны юнак, і дадае: — Адной з маіх славутасцей з’яўляецца крэпасць! У ноч на 22 чэрвеня 1941 года яна першай прыняла на сябе ўдар нямецка-фашысцкіх захопнікаў і дваццаць восем дзён стрымлівала націск ворага.

— Брэсцкая крэпасць-герой! Дык ты Брэст! Я ведаю, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь страціла кожнага трэцяга свайго жыхара! 22 чэрвеня — Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа!

Размову падтрымлівае трэці брат, станісты, з адкрытым позіркам хлопец:

— Мяне называюць жамчужынай Палесся! Сучасная гісторыя майго краю цесна звязана з Чарнобыльскай трагедыяй, якая стала адной з самых

жахлівых падзей XX стагоддзя. Яна змяніла светапогляд людзей, прымусіла кожнага перагледзець свае жыццёвыя каштоўнасці.
— Гомель! — упэўнена адказваю хлопцу.
— А я культурны цэнтр Беларусі, — працягвае аповед чацвёрты брат, ветлівы, добразычлівы юнак. — Усім вядомы міжнародны фестываль «Славянскі базар»! Больш за трыццаць гадоў збірае ён аматараў музыкі з усяго свету!
— Пазнаю цябе, Віцебск! Вельмі люблю музыку і сама спяваю!
— А маё імя звязана з прыгожай беларускай легендай пра магутнага драпежніка, цара звяроў, — уступае ў размову пяты брат, моцны, нетаропкі ў рухах хлопец.
— Ведаю гэту легенду! Беларускі паэт Янка Купала ў сваёй паэме «Магіла льва» апавядае пра паходжанне тваёй назвы, Магілёў! — гавару ў адказ.

Убаку ад усіх стаіць дзіўнай прыгажосці юнак. Яго вочы хітра ўсміхаюцца. Штосьці роднае бачыцца мне ў яго позірку. Роднае і знаёмае.
— Гэта ты, мой любы Гродна? — пытаюся я, паглядаючы на шостага волата.

Ён задаволена ўсміхаецца і кажа мне:
— Пазнала, зямлячка...Не сумняваўся...Тады прадстаў мяне сама!
— Канешне! Лёгка! Мой Гродна — жывапісны горад на беразе бацькі-Нёмана! Стары і Новы замкі, велічная Каложа, Фара Вітаўта... Усяго не пералічыць! Але самая вялікая каштоўнасць маёй малой радзімы — людзі! Яны яго душа! Гродзенцы вельмі гасцінныя і добразычлівыя! Візітная картка горада — Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. На ім збіраюцца ўсе, хто называе Беларусь сваёй Радзімай! І я наведваю гэты фестываль з бацькамі: мой тата — рускі, а мы з мамай — беларусачкі! Людзі ўсіх нацыянальнасцей жывуць на Беларусі дружна!

У час размовы я мімаволі паглядаю на зацікаўленую нашай гутаркай жанчыну. Толькі зараз заўважаю, што ў пшанічных валасах яе гусцее сівізна... А якія напрацаваныя ў жанчыны рукі — усе ў мазалях! Відаць, што не белаучка! Слухаючы аповед хлопцаў-гарадоў, яна то слёзы выцірае хусцінкай, то ўсміхаецца, і вочы яе свецяцца шчасцем. Жанчына паглядае на хлопцаў-волатаў з гонарам і замілаваннем ... маці...Маці-Беларусі!
— Як жа завуць цябе, разумнічка? — ласкава пытаецца жанчына ў мяне.
— Славяна! — з гонарам адказваю ёй.

Маці-Беларусь шчыра ўсміхаецца і працягвае мне кветкі, букецік васількоў... Я з удзячнасцю і любоўю паглядаю на яе.
— Дачушка, — гаворыць маці-Беларусь, звяртаючыся да мяне. — Любі і беражы свой родны край! Захоўвай памяць продкаў, іх культуру, традыцыі! Ад цябе залежыць будучыня Радзімы!

Хлопцы-волаты моцна бяруцца за рукі і пачынаюць кружыцца вакол маці-Беларусі! І я разам з імі! Я, Славяна...

Расплюшчваю вочы... За вокнамі бачу краявіды любімага Гродна... Прыехалі. Няўжо заснула ў дарозе? Які дзіўны сон! Але час збіраць рэчы і выходзіць з аўтобуса. Сумачка, фотаапарат, парасон...Любімая кніга нечакана падае з крэсла, разгортваецца..., на яе старонках ляжаць кветкі, букецік васількоў... Яны вельмі падобныя да вочак беларусаў.